**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**Установа адукацыі "Беларускі дзяжаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"**
Факультэт беларускай і рускай філалогіі
Кафедра беларускага мовазнаўства

**Вайдак Дзіяна Станіславаўна**

# Параўнанне як вобразны сродак мовы ў раманах Генрыха Далідовіча "Гаспадар-камень" і Янкі Брыля "Птушкі і гнёзды"

**Дыпломнае даследаванне**

**Навуковы кіраўнік –**
**кандыдат філалагічных навук, дацэнт**
**Т. Я. Старасценка**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Мінск, 2013**

// РЭЗЮМЭ

Вайдак Дзіяна Станіславаўна

**Параўнанне як вобразны сродак мовы ў раманах Генрыха Далідовіча “Гаспадар-камень” і Янкі Брыля “Птушкі і гнёзды”**

**Ключавыя словы:** параўнальныя канструкцыі, суб’ект параўнання, аб’ект параўнання, аснова параўнання.

**Аб’ект даследавання** – мова рамана Генрыха Далідовіча “Гаспадар-камень” і мова рамана Янкі Брыля “Птушкі і гнёзды”.

**Прадмет даследавання –** параўнальныя канструкцыі ў раманах Генрыха Далідовіча “Гаспадар-камень” і Янкі Брыля “Птушкі і гнёзды”.

**Мэта даследавання –** прааналізаваць параўнанне як мастацкі троп з пэўнымі функцыямі і формамі яго выражэння.

**Метады праведзенага даследавання** апісальны, які ўключае прыёмы лінгвістычнага назірання за параўнаннем, абагульнення, сістэматызацыі і інтэрпрэтацыі параўнанняў як дыскурсіўных утварэнняў; метад кампанентнага і трансфармацыйнага аналізу, які дазваляе выявіць мінімальныя сэнсавыя элементы і іх камбінаванне ў імпліцытнай семантыцы вобразнага параўнання; кантэкстуальнага аналізу, які дазваляе выявіць ролю параўнанняў у тэкставай рэпрэзентацыі празаічнай карціны свету.

У дыпломным даследаванні разглядаецца параўнанне як аб’ект лінгвістычнага даследавання, вылучаюцца асаблівасці параўнальных канструкцый у мове раманаў Генрыха Далідовіча “Гаспадар-камень” і Янкі Брыля “Птушкі і гнёзды”, класфікуюцца параўнальныя канструкцыі паводле часцінамоўнага выражэння асновы, вылучаюцца спосабы ўтварэння параўнання, праводзіцца паралель паміж параўнальна-раўналежнымі і вобразнымі параўнальнымі зваротамі.

**Навуковая навізна атрыманых вынікаў** заключаецца ў паглыбленні і сістэматызацыі тэарэтычных ведаў пра параўнальныя канструкцыі, іх класіфікацыю, асаблівасці ўжывання параўнальных канструкцый у мастацкай літаратуры.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыялы дыпломнай работы могуць быць выкарыстаны ў далейшых даследаваннях беларускай лінгвістыкі, пры падрыхтоўцы лекцый, урокаў і факультатыўных заняткаў па тэмах “Параўнанне як сродак мастацкай выразнасці”, “Параўнальна-раўналежныя і вобразныя параўнальныя звароты”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ